**ПО́ЛАЦКАЯ СПА́СА-ПРААБРАЖЭ́НСКАЯ ЦАРКВА́**, помнік архітэктуры, адна з першых пабудоў Полацкай архіт. школы. Пабудавана дойлідам Іаанам паводле заказу Ефрасінні Полацкай паміж 1152–61 на тэр. Полацкага Спаса-Праабражэнскага (Ефрасіннеўскага) манастыра, у мясцовасці пад назваю Сяльцо, што належала полацкаму епіскапу. Знаходзіцца за 2,5 км на Пн ад Верхняга замка на правым беразе р. Палата. Адносіцца да 6-слупавых 3-нефавых крыжова-купальных храмаў з адной выступаючай вонкі апсідай. Памеры (з улікам апсіды) 18,3 × 10 м. Выш. храма да вяршыні цаглянага купала 20,37 м, таўшч. сцен 1,2–1,3 м. Цэнтр. неф завяршаецца масіўнай выступаючай апсідай, бакавыя, вельмі завужаныя нефы – схаванымі ва ўсх. сцяне паўцыркульнымі нішамі. Царква мела packамарнае перакрыцце асн. аб'ёму. Барабан купала абапіраецца на масіўны квадратны пастамент, грані якога аздоблены 3-лопасцевымі какошнікамі кілепадобнай формы. Для мацавання іх быў зроблены спец. каркас з пастаўленых на рабро цаглін. Закамары і какошнікі разам з высокім (6,4 м) барабанам стваралі выцягнуты ўверх вежападобны сілуэт храма. Звонку сцены царквы былі аздоблены паўкруглымі пілястрамі. Унутры зах. сцяны – лесвіца



*Полацкая Спаса-Праабражэнская царква (рэканструкцыя У.Ракіцкага).*

на хоры, паабапал хораў – 2 невял. келлі. Падлога была выкладзена керамічнымі пліткамі, пад ёй знаходзілася крыпта. Храм пабудаваны з плінфы ў тэхніцы «схаванага рада», што надавала яго знешняму выгляду бела-ружовую пярэстасць. Памеры цаглін 4 × 23 × 24–30 см, некаторыя шыр. 17–20 см. На шэрагу з іх маюцца знакі і клеймы. Унутраныя сцены і слупы сабора захавалі арыгінальны фрэскавы роспіс, нягледзячы на алейны запіс 19 ст. У фрэсках назіраецца аўтарская перапрацоўка класічных візантыйскіх сюжэтаў, якія размешчаны адпаведна канону. Выявы маюць надзвычайную экспрэсію і ўнутраную дынаміку.

У 19 ст. храм быў накрыты 2-схільным дахам і часткова перабудаваны. Апошняе не пашкодзіла захаванасці яго першапачатковай архітэктуры. Даследавалі помнік Дз.Струкаў (1884), М.Брунаў (1923), І.Хозераў (1926 і 1946), Я.Ашчэпкаў (1946–47), П.Рапапорт і Г.Штэндар (1976). У 2005 Дз.У.Дукам праведзены археал. раскопкі культ. пласта ў крыпце царквы, дзе размешчана 8 цагляных склепаў, зробленых з вялікафарматнай цэглы ў 2-й пал. 18 ст. Склепы былі пашкоджаны скарбашукальнікамі: з 8 некранутым застаўся толькі адзін. Знойдзены астанкі 32 чал. У некранутым склепе знойдзены перапахаваныя астанкі 6 мужчын сталага ўзросту. Косткі былі абгорнуты дарагой тканінай з сярэбранай ніткай і пакладзены ў драўляную скрыню. Пахаванне належала людзям каталіцкага веравызнання (высветлена па наяўнасці адпаведнага пахавальнага інвентару) і адносіцца да часу, калі царква ўваходзіла ў склад езуіцкага фальварка ў мяст. Спас.

*Літ.*: Шчакаціхін М. Нарысы з гісторыі беларускага мастацтва. Менск, 1928; Алексеев Л.В. Полоцкая земля в IX–XIII вв.: (очерки истории Северной Белоруссии). М., 1966; Раппопорт П.А. Полоцкое зодчество 12 в. // СА. 1980. №3; Дук Дз.У. Гісторыя Полацка: па матэрыялах археал. даслед. Наваполацк, 2006.

*С.В.Тарасаў, Дз.У.Дук.*